Пакідаць свой «апошні вагон» Косцю не хочацца, тым не менш ён так і не пераадолеў уласную няўпэўненасць: «…узяў сваё паліто, але не стаў надзяваць яго, а проста перакінуў цераз руку. А сам усё яшчэ пе падымаўся» [2, с. 273]. «Апошні вагон» у асэнсаванні Я. Васілёнка — гэта нявыкарыстаны шанц на асабістае шчасце, увасабленне няспраўджанасці надзей, безвыходнасці праз свае памылкі. Гэтае падарожжа ў цягніку можна разглядаць як метафару жыццёвага шляху героя, непазбежнасці расстання праз нерашучасць.

Вобраз чыгункі ў творах беларускай літаратуры дэталізуецца і праз апісанне вакзала, які непарыўна звязаны з матывам чакання. Вакзал — гэта месца, дзе сыходзяцца шляхі, дзе людзі развітваюцца і сустракаюцца, дзе адбываюцца самыя нечаканыя гісторыі.

У апавяданні Я. Васілёнка «Помнік» вобраз вакзала не з'яўляецца цэнтральным, аднак выконвае значную ролю ў раскрыцці ідэі твора, у якой тэма сучаснасці паяднана з памяццю пра вайну. Менавіта з вакзала Павел Лыкоўскі пачынае сваё падарожжа ў мінулае, у сяло Сысоеўку, з якім звязаны яго ўспаміны пра загінуўшага сябра Аляксандра Пасмітнага. У дарозе Павел адчувае невядомасць і чаканне: «Лыкоўскаму не хацелася, каб хто ведаў, што ён прыехаў у Сысоеўку, і таму нікому ён не хацеў быць спадарожнікам» [2, с. 218]. Герой апавядання не ведае, як яго сустрэнуць у вёсцы, сумняваецца, ці памятаюць там пра Сашу, ці захавалася яго магіла, ці з'явіўся помнік герою вайны. Вакзал становіцца месцам, дзе Павел вымушаны чакаць раніцы, каб працягнуць свой шлях, тут у думках ён шукае адказ на пакутлівыя пытанні. Менавіта ў Сысоеўцы, куды едзе Павел, калісьці немцы закатавалі Сашу. Павел Лыкоўскі ў час вайны папрасіў мясцовага жыхара, дзеда Нічыпара, паставіць помнік салдату. Сімвалічна, што пасляваенная сустрэча герояў адбываецца таксама менавіта на вакзале, адкуль і пачынаецца развіццё дзеяння ў творы.

**Заключэнне.** Такім чынам, змест вобраза чыгункі ў творах беларускай літаратуры не абмяжоўваецца адлюстраваннем тэхнічнага прагрэсу або апісаннем транспартнай інфраструктуры. Ён уяўляе сабой шматгранны мастацкі феномен, які раскрывае розныя аспекты чалавечага жыцця, гісторыі. Вобраз чыгункі характарызуецца ў асноўным станоўчымі канатацыямі. Гэта сімвал новага часу, прагрэсіўнага развіцця. У асобных творах пісьменнікамі ставіцца пытанне пра неадназначнасць змен, выкліканых тэхнічным прагрэсам. Апісваючы сучаснае жыццё, аўтары звяртаюцца да вобраза чыгункі, каб глыбей раскрыць характары герояў, выявіць іх жаданне атрымаць новыя ўражанні, вырашыць важныя пытанні. Падарожжа ў цягніку дае магчымасць самапаглыбляцца, рэфлексаваць, назіраць за жыццём і людзьмі.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Чорны, К.* Збор твораў у васьмі тамах : у 8 т. / рэд. калегія : В. В. Барысенка [і інш.]. — Мінск : Маст. літ., 1972. — Т. 1 : Апавяданні 1923—1927 / рэд. тома В. В. Барысенка, падр. тэкстаў і камент. А. Д. Атаева, А. Ф. Харкевіч. — 554 с.
2. *Васілёнак, Я. П.* Выбраныя творы : у 2 т. / рэд. савет : Е. А. Пяршай [і інш.]. — Мінск : Маст. літ., 1977. — Т. 1 : Апавяданні / рэд. савет : Е. А. Пяршай [і інш.]. — 360 с.

УДК 821.161.3

**Т. М. Пучынская, Г. В. Вярбіцкая**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

## МАСТАЦКІ ВОБРАЗ ЧЫГУНКІ Ў ТВОРАХ ВАЕННАЙ ТЭМАТЫКІ

**Уводзіны.** У шматлікіх творах ваеннай тэматыкі адметнае месца займае вобраз чыгункі, якая стала своеасаблівым сімвалам супраціўлення нямецкім акупантам.

У дадзенай працы мастацкі вобраз чыгункі аналізуецца на матэрыяле твораў В. Быкава, а таксама І. Навуменкі — народных пісьменнікаў, непасрэдных удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Агульная рыса іх прозы — адлюстраванне вопыту ваеннага юнацтва.

**Асноўная частка.** Вобраз чыгункі В. Быкаў часта выкарыстоўвае ў «партызанскіх» аповесцях. Пісьменнік звяртаецца да гісторыі «рэйкавай вайны» — аперацыі партызан па масавым разбурэнні чыгуначных камунікацый на акупаванай тэрыторыі. Паводле звестак Энцыклапедыі гісторыі Беларусі, толькі за першы перыяд «рэйкавай вайны» «…перавозкі для групы нямецкіх армій «Цэнтр» скараціліся на 40 %» [1, с. 168]. Такая гераічная старонка змагання народа не магла застацца па-за ўвагай беларускіх пісьменнікаў.

У творах В. Быкава няма шырокага адлюстравання «рэйкавай вайны» як стратэгічнай аперацыі. Аднак эпізоды з падрывам чыгункі раскрываюць масавы гераізм партызан, якія ўдзельнічалі ў дэзарганізацыі ваенных перавозак ворага.

Матыў падрыву «жалезкі» вызначае змест асобных эпізодаў у аповесці «Воўчая зграя». Яе галоўны герой, партызан Ляўчук, у час вайны трапляе ў складаную сітуацыю і вымушаны змагацца за выжыванне. В. Быкаў драматызуе дзеянне, якое адбываецца ў творы, паступова. Атрад Колабава атрымлівае задачу падарваць чыгунку, і спачатку ўсё складваецца нядрэнна: «Ахова іх праварoніла, яны хутка падклалі міну і праз хвілін дваццаць грымнулі цяжка нагружаны эшалон, што ішоў у бок фронту» [2, с. 45]. Аднак абставіны ўсё больш супрацьстаяць героям. У творы акцэнтуецца ўвага на складанасці пастаўленай вайсковай задачы: таемна прабрацца да чыгункі праз лес, пераадолець магчымыя патрулі і замаскіраваць міну. В. Быкаў паказвае



Рэпазіторый БарДУ

шматлікія цяжкасці, з якімі сутыкаюцца партызаны: складаны рэльеф мясцовасці, пастаянная рызыка. Падрыў чыгункі адбываецца зімой: «На каляды ў сорак трэцім яны рвалі «жалезку» [2, с. 45], што таксама стварае дадатковыя перашкоды для герояў аповесці. Умовы «рэйкавай вайны» патрабавалі ад партызан дзеянняў хуткіх і рашучых: «… У іх была адна міна-запаска, якую грэх было несці назад, у пушчу, і наступнаю ноччу яны, даўшы добрага круку, падышлі да чыгункі з другога, лясного боку. <…> дачакаліся, калі патрулі пайшлі ў бункер грэцца, і тады паставілі міну» [2, с. 46].

Чыгунка ў аповесці «Воўчая зграя» выступае як своеасаблівая мяжа паміж бяспекай і пагрозай. З аднаго боку ад насыпу знаходзіцца лес, дзе партызаны могуць схавацца і атрымаць часовую абарону, з іншага — адкрытая прастора, дзе яны становяцца лёгкай мішэнню для нямецкага патруля. Перасячэнне гэтай мяжы звязана з вялікай небяспекай, што падкрэсліваецца ў апісанні бою.

Яшчэ больш прыкметна вобраз чыгункі і спалучаны з ім матыў падрыву рэек прысутнічае ў аповесці В. Быкава «У тумане». Акупанты перавозяць на цягніках важныя грузы ноччу, што сведчыць пра тое, наколькі сур'ёзныя перашкоды стваралі ворагу партызаны: «…Немцы паязды на ўсход сталі пускаць ноччу. Што яны там везлі, пуцейцы не маглі бачыць, але так меркавалі, што, мабыць, важныя грузы, можа, танкі нават, калі для перавозкі карысталіся выключна цёмнай парой сутак» [3, с. 28].

В. Быкаў апісвае тыповую сітуацыю часоў «рэйкавай вайны»: разбурэнне чыгункі і пакаранне немцамі падрыўнікоў. Галоўны герой твора, пуцеец Сушчэня, здаўна працаваў на чыгунцы, «але месяц назад, будучы арыштаваны паліцыяй за дыверсію ля Выспянскага моста, купіў сабе жыццё тым, што выдаў сваіх саўдзельнікаў, сваіх жа чыгуначнікаў, якія яму памаглі развінціць рэйкі. Хлопцаў павесілі ў мястэчку, а Сушчэню выпусцілі…» [3, с. 1]. Акупанты наўмысна зняславілі Сушчэню, каб усе палічылі яго здраднікам. Аднак герой аповесці годна праходзіць праз выпрабаванні. Такім чынам, матыў падрыву чыгункі ў творах В. Быкава спалучаецца з думкай пра гераізм народа, яго непераможнасць. Пісьменнік заўсёды за масавым подзвігам на вайне бачыць уклад у перамогу асобнага чалавека.

У аповесці В. Быкава «Пайсці і не вярнуцца» вобраз чыгункі паказваецца эпізадычна і выяўляе матыў пошуку героямі паратунку ад ворагаў. У цэнтры сюжэта — маладая партызанка Зоська Нарэйка, якая атрымлівае заданне ўсталяваць сувязь з падпольнай групай. Хаваючыся ад немцаў, героі перамяшчаюцца ўздоўж транспартнай камунікацыі: «Сяржант рыўком ускочыў на ногі, штось крыкнуў і кінуўся цераз рэйкі, адразу знікшы на тым баку аднапуткі. За ім, азірнуўшыся, з меншым спрытам перабег рэйкі Пашка» [4, с. 71]. Нягледзячы на тое, што чыгунка дае героям часовую абарону, яна не гарантуе поўную бяспеку. У цэлым вобраз чыгункі ў аповесці «Пайсці і не вярнуцца» з'яўляецца часткай «ваеннага ландшафту», які аказвае ўплыў на лёс герояў.

Значную мастацкую ролю вобраз чыгункі выконвае ў рамане І. Навуменкі «Сасна пры дарозе». Чыгунка ў творы адлюстроўвае змены, якія адбываюцца ў сувязі з пачаткам вайны. Гэты вобраз непасрэдна звязаны з жыццём галоўнага героя — Міці Птаха, сына пуцявога абходчыка. У асобе маладога чалавека адлюстраваны тыповыя рысы моладзі, чыё юнацтва, як і самога аўтара, азмрочыла вайна.

Чыгунка ў мірны час для герояў рамана І. Навуменкі — акно ў свет, «развілка і скрыжаванне», месца, дзе пануе «лад і парадак», а вечарам — «вялікая цішыня». Гэта дарога, якая «была тут заўсёды». Уздоўж чыгункі на тыповы беларускі лад «…лапушыцца бульба, добра родзіць і проса, і ячмень, і мак» [5, с. 9]. Вайна, аднак, разбурыла звыклы свет. Чыгунка стала месцам трывогі і небяспекі, аб'ектам ваенных дзеянняў.

Спачатку маладыя патрыёты, хлопцы і дзяўчаты з «баявой дружыны», ахоўвалі чыгунку, але затым зразумелі, што праз бамбёжкі і разбурэнні яе абход і рамонт сталі непатрэбнымі: «Масты паўзрываны, рух спыніўся, таму рамантаваць чыгунку, а тым больш ахоўваць яе, няма ніякага сэнсу» [5, с. 41]. Паступова чыгунка ператварылася ў шлях для бежанцаў і палонных. Яна стала сімвалам хаосу і трагедыі вайны, калі людзі вымушаны былі пакідаць свае дамы і шукаць выратавання: «З усходу на захад і з захаду на ўсход ад рання да вечара пыльным шляхам і чыгункай ідуць людзі. Гэта акружэнцы, бежанцы і палонныя, якім пашэнціла вырвацца з лагераў» [5, с. 93]. У рамане «Сасна пры дарозе», такім чынам, вобраз чыгункі звязваецца з матывам бежанства.

І. Навуменка раскрыў вобраз чыгункі ў дынаміцы: мірны час — хаос на транспартнай камунікацыі ў пачатку ліхалецця — актыўнае супрацьстаянне немцам, «рэйкавая вайна». Раман «Сасна пры дарозе» пачынаецца з апісання чыгуначнага пераезда, заканчваецца твор таксама паказам чыгункі. У заключным эпізодзе партызаны прыходзяць да Сцяпана Птаха, каб развінціць рэйкі і пусціць пад адхон нямецкія цягнікі.

**Заключэнне.** Такім чынам, вобраз чыгункі ў творах В. Быкава і І. Навуменкі непасрэдна звязаны з асноўнымі матывамі ваенных гадоў.

Чыгунка ў асэнсаванні беларускіх пісьменнікаў паўстае як арэна мужнага супраціўлення, дзе партызаны здзяйсняюць дыверсіі супраць акупантаў, парушаючы камунікацыі і знішчаючы варожую тэхніку і жывую сілу. Адначасова яна з'яўляецца месцам трагедыі, сведкам чалавечых пакут і выпрабаванняў. Чыгунка — гэта таксама і шлях вымушанага перамяшчэння людзей ва ўмовах вайны. Дарога не толькі нясе на сабе цяжар палонных, шматлікіх бежанцаў, але і дорыць героям надзею на вяртанне дадому, мірнае жыццё.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2001. — Т. 6., Кн. 1 : Пузыны — Усая. — С. 168.
2. *Быкаў, В.* Воўчая зграя : аповесць / В. Быкаў. — Мінск : Маст. літ., 1975. — 143 с.



Репозиторий БарГУ

3. *Быкаў, В.* У тумане : аповесці / В. Быкаў. — Мінск : Маст. літ., 1989. — 381 с.
4. *Быкаў, В.* Пайсці і не вярнуцца : аповесці / В. Быкаў. — Мінск : Маст. літ., 1979. — 260 с.
5. *Навуменка, І.* Сасна пры дарозе : раман / І. Навуменка. — Мінск : Нар. асвета, 1980. — 336 с.

УДК 821.161.3

**Т. М. Пучынская, В. А. Канапацкая**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# ФЛАРЫСТЫЧНЫЯ ВОБРАЗЫ ЯК УВАСАБЛЕННЕ МАТЫВУ КАХАННЯ Ў ВЕРШАХ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

**Уводзіны.** Фларыстычныя вобразы ў паэзіі Яўгеніі Янішчыц займаюць асаблівае месца. Яны выяўляюць глыбіню духоўнага свету лірычнай гераіні і маюць высокую эстэтычную значнасць. Расліны ў вершах Я. Янішчыц — не толькі прыродныя вобразы, але і мастацкія сімвалы, метафары, якія ўвасабляюць думкі і жыццёвыя перажыванні паэткі. Кожны фларыстычны вобраз, ад зялёнага саду да яркай каліны, адлюстроўвае непаўторны лірычны талент Я. Янішчыц, якая стварае ўнікальны паэтычны свет, дзе каханне, адзінота і надзея існуюць разам.

У дадзенай працы ставіцца задача вызначыць сімвалічную семантыку, мастацкую функцыю фларыстычных вобразаў у вершах Я Янішчыц, звязаных з матывам кахання.

**Асноўная частка.** Вобразы раслін у паэзіі Я. Янішчыц маюць інтымна-псіхалагічную напоўненасць і часта выяўляюць матыў кахання. Інтымная лірыка складае эмацыянальны цэнтр творчасці паэткі. Яе лірычнай гераіні ўласцівы розны душэўны стан: ад узнёслай закаханасці, урачыстасці да шчымлівага болю, зажуранасці і самоты.

Вобраз яблыневага саду адпавядае настрою радасці, юнацкай летуценнасці. Сад з'яўляецца адным з архетыпічных вобразаў чалавечай культуры, гэта ўвасабленне шчасця, чысціні. Дадзены вобраз прысутнічае ў вершах многіх паэтаў (Я. Купала, М. Багдановіч, Я. Журба, П. Панчанка, А. Грачанікаў, Р. Баравікова і інш.). Я. Янішчыц таксама выкарыстоўвае гэты рамантычны вобраз і стварае свой «сад кахання». У вершы «Каханне сад і ластаўка вясны» сад становіцца сінонімам шчасця, духоўнай красы і вясновага адраджэння: «Такой прысні, як яблыневы сад. // Там не ачахла сонечная сцежка. // Хвалюецца высокі снегапад, // А на губах — іскрыстая усмешка» [1, с. 162].

У адным з найбольш вядомых вершаў Я. Янішчыц «Ты пакліч мяне. Пазаві…», дзе каханне асэнсоўваецца як аснова свету, таксама прысутнічае фларыстычны вобраз — «хмельныя травы». Хмель — шматгадовая расліна, якая характарызуецца імклівым ростам, незвычайнай устойлівасцю да неспрыяльных умоў жыцця. У народных творах ён сімвалізуе сілу, гнуткасць, мудрасць, ураджайнасць, плоднасць і дабрабыт. Аднак Я. Янішчыц выкарыстоўвае вобраз «хмельных траў» не для ўказання на канкрэтную расліну, а найперш для абазначэння незвычайнага душэўнага стану лірычнай гераіні, асаблівай узрушанасці яе эмоцый, пачуцця найвышэйшай асалоды, звязанай з каханнем: «Ты пакліч мяне. Пазаві. // Там заблудзімся ў хмельных травах. // Пачынаецца ўсё з любві, // нават самая простая ява» [2, с. 18].

Фларыстычныя вобразы каліны, шыпшыны, палыну, ядлоўцу, дурману ў вершах Я. Янішчыц выяўляюць іншыя эмоцыі: трывожныя перажыванні і драму адзінокага чалавека.

Выразную сімволіку са значэннем смутку, неспакою ў лірыцы Я. Янішчыц мае вобраз каліны, характэрны фальклорным творам. У народных песнях гэтае дрэва ўвасабляе дачаснае расстанне, горкі жаночы лёс. Матыў нешчаслівага кахання суадносіцца з чырвоным, як кроў, колерам ягад каліны, іх горкім смакам. Адпаведна фальклорнай традыцыі лірычная гераіня верша Я. Янішчыц «Нясуджаны, я так скажу аднойчы…» атаясамлівае сябе з калінай: «…Калі святло ад недаверу згіне, // Няспешна прывітай яе спярша: // Я так цябе чакала, што ў каліне // Адбілася ўся мая душа!» [1, с. 123].

Вобраз каліны даў назву паэтычнаму зборніку Я. Янішчыц — «Каліна зімы». Лейтматывам гэтай кнігі з'яўляецца «аклятая разлука». У аднайменным вершы вобраз «каліны-сяброўкі» ўзмацняе драматызацыю ўнутранага стану лірычнай гераіні: «Выберу сёння якую вандроўку, // Каб неўталоннай душы дагадзіць? // Светла аклікну каліну-сяброўку — // Сумам маім на мяне паглядзіць» [1, с. 90]. Каліна, як «позняя ягадка позняй спакусы», выяўляе глыбокія душэўныя перажыванні гераіні твора. Асабліва выразна пачуццё неспакою ракрываецца на фоне зімовага пейзажу. Жывыя, пунсовыя ягады каліны кантрастуюць з халодным снегам. Яны сімвалізуюць запозненае каханне, няпросты жаночы лёс. Аднак для лірычнай гераіні каліна, яе яркае полымя — гэта адначасова і чаканне, радасць: «доля мая — нібы гронка любові» [1, с. 90]; «гронка яе — як надзея жыцця» [1, с. 90]. Перажываючы расчараванне, крыўду, гераіня Я. Янішчыц імкнецца знайсці маральную падтрымку ў раслін, дрэў, кветак. У паэтычных радках многіх яе вершаў гучыць адначасова горка-аптымістычная, сумна-радасная інтанацыя: «З жаўталістым ветрам заручоная, // Цеплячы гаючы успамін, // Да-гарай, мая зара вячэрняя, — // Хай пасвеціць полымя калін!» [3, с. 79].

Для выяўлення ў лірыцы пачуццяў суму, расчаравання Я. Янішчыц выкарыстоўвае і вобраз прыгожай, але калючай кветкі — шыпшыны. Ён становіцца мастацкім увасабленнем складаных стасункаў асабістага

Рэпазіторый БарДУ